БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя адчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня.
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз.
У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць пер сыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з даставкай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 ру(
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 47. Менск. Серада 22 мая 1918 г. Год I

Менск 22/г.

ЯНА ІДЗЕЦЬ.

Сярод усе іншчэ вялікай лічбы ваенных паведамленьяу аб спатычках ваюючых старон на моры і на сушы, сярод інформацыяу датычучых вайны, цепе, як ясная зорачка у чорнай глыбіне неба у ніпагодную асеннюю ноч, выгляне часамі на сьвет вестка аб згодзе.

І неяк хочацца верыць больш ім, гэтым далекім, нісьмелым зоркам, чым ваяунічаму запалу аб якім публікуюць газэты. Народы Эуропы змучыліся вайною, вашарпанае цело іх патрабуе моцнага і доугаго адпачынку. Іншыя народы так сама змарыліся ад трывогі за сваю будучыну, змарыліся пасуючыся да новаго ніпармальнаго стану дзержауных Эурапэйскіх адзінак, з якімі яны, паміма іх волі, дзякуючы сучаснай матэрыяльнай культуры, зьвязаны нівідпымі, але моцнымі ніцямі экапамічных і духоуных стасункау.

Такою зорачкай на цемным небі ндауна паказалася у нямецкіх газэтах вестка аб замеры нэйтральных дзержавау іншчэ раз узяць на сябе ініцыятыву згоды паміж ваюючымі народамі, на гэты раз болей моцную, болей шырокую.

Подлуг з ей стаіць вестка аб ангельскіх умовах згоды, названных лордам Керзонам: справядлівасьць, ушанаванне гонару суpраціунікау і трывалась̆ць. Тое, што гэтыя словы члена ваеннаго габінэту Англіі нібы стаяць у спрэчнасьці з весткамі аб ваенных прыгатаваннях дзержавау коаліцыі, ні павінна абезрабіваць нас у надзеі. Важна,—што афіцыяльныя прэдстаунікі лічуць патрэбным і знайходзяць спосаб гаварыць аб згодзе і абвешчаць яе варункі.

І яшчэ больш узмацняючым надзею ідзець з Заходу вестка аб пекным учынку нямецкіх уладау, якія пазваляюць варочацца бэльгійскім уцекачом на родныя іх мейсцы выдаючы пры гэтым магчымую запамогу.

Тамака на змучанай вайною бэльгійскай зямлі як і у нас заціхае гарматні сьвіст, варочаюцца вясельня паранкі і ціхія вечары і сейбіт дзякуючы Богу за дараваны дзень выходзіць на змаркоціушаееся на ім поле.

Старая-прастарая ведзьма—вайна адзін па адным траціць зубы каторымі яна іншчэ дагэтуль грызець сьвет, а на вясновым, іншчэ займгленым людскай злосьцю, небі часьцей і часьцей паказуецца ясны візарунак *яе*, спакойнай, пекнай, даруючай жыцце, згоды.

Яна ідзець!

Белая бярозка.

Белая бярозка
Уся пакрыта роскай.
Смачна напілася,
Сокам налілася:
Сонцо абагрэло,—
Уся зазелянела.
Корні пад зямлею
Разраслiся у двое.
А у вярху галіны
Шэпчуць над далінай.
Цеплы ветрык веіць,
Цеплы ветрык сеіць
Легкае насенне
Аж на загуменні.
Ручаек шумлівы
Між далінай, нівай
Кволы плод вясновы
Носіць на заховы
Сьвежанькай зямліцы
Ля жывой вадзіцы:
Хай за цепло летко
Развядуцца дзеткі
Той бярозкі белай
Ціхай і нісьмелай.
Род яе ні згіне
У глухой лагчыне.

Ясакар.

Агульныя вест.

БЭРЛІН 18 гм. Канцлер граф Гэртлінг сказаў у размове с корэспондэнтам вэнгерскай газэты «Az. Est.»: «Я усё такі настолькі іншчэ оптыміст,—што веру у канец вайны у гэтым годзе. Спадзяюся, што развіцце падзеяў на Заходнім фронце прыблізіць нас да скораго канца вайны.

(Kreuz-Zeit, № 250)

— «Manchester Gvardian» зьмесьціла ліст нідаўна памёршаго ангельскаго палітычнаго дзеяча лорда Кутпей. У лісьце нябошчык поўстаець проціў зацягвання вайны. Ен думае ні адна з групп ваюючых дзержаваў ні можа быць пабіта. Бэрлін для ангельцаў станецца нідасягаемым. Яны ні патрапяць адціснуць немцаў у бок Рэйну. Якой мэце можа служыць далейшае нішчэнне людскіх сілаў, культуры і хрысьціянства? Пара разумным і шчырым людзям усіх краёу падняцца проці бойні, якой ні відаць канца.

(«Norddeutsehe Allgem» № 252.

Малая фортэцыя Іно што на дарозе з Выбаргу у Пецярбург занята фінляндцамі.

(Nordd. Allgem, № 252)

У Фінляндзіі узмагаецца рух за устаноулепне фінляндскай дзержаунасьці з манархічнай формай ураду. За гэтую форму стаяць старофінны і швэды. Погляд младо фінау і аграрыяу падзелены,—20 соцыял-дэмакратау проці такога рашэння пытання.

Лендан 14 гм. «П. Т. А.» «Морнінг Пост» гаворучы аб патрэбі даць падтрыманне Расіі гаворыць: «час ангельскаму народу перастаць верыць тым глупетствам, якімі кормяць яго нашыя пісьменнікі і газэтнікі у сваіх артыкулах і баданнях аб Расіі, што гэта нікультурная, поуграматная старана, што толькі у працягу апошніх гадоу рускі народ пачау крыху разумець значэнпе парлямэнтарызму, што, калі пачалася рэвалюцыя, еп ні здоляу утрымацца на сярэдзіне паміж самадзержауем: што і Расіі магчыма толькі самадзержауны парадак.

Весткі з Расіі.

— ПЕТРОГРАД 15 гм. Подлуг «Ізвестія'ў» Камісарыят па справам друку аб'яуляе ні істнуючымі усе дазваления на выдаўніцтво газэт, выданыя да 15 мая. Усе газэты вышоўшыя за гэтымі дазваленнямі часова запыняюцца. Газэты «Вечерняя Заря», «Воля» і «Наши Вѣдомости» зачыняюцца.

14 мая прэдстаўнікі някаторых Петроградскіх газэт звярнуліся да камісара друку Валадарскаго с запытаннем аб долі зачыненых вячэрніх і некаторых і ранічных газэтаў. Валадарскі заявіў, што усе газэты зачынены за сыстэматычна-хвальшывыя весткі, якія яны зьмешчалі на працягу 2-х месяцоў. Што датыча «Нашаго Вѣк'у» то яму прэд'явіцца абвінавачэнне у гасударсьцьвенай ізмені за апраўданне перавароту стаўшаго на Украіне. Валадарскі заявіў, што савецкая ўлада будзе змагацца с прэссай да той пары, што аж змусіць яе даваць суменную інформацыю.

— З ІРКУЦКА ад 15 гм. месяцу паведамляюць што на «семеновском» фронце 12 і 15 гм. ішлі баі каля ст. Спі у каторых проціў большэвіцкіх войск выступіло да тысячы пяхоты і кавалерыі с трама гарматамі і кулямётамі. Семёноуцы ні вытрымалі бою і адступілі.

У Маймачыне проціў савецкаго войска выступае аддзел белай гвардзіі які большэвікі спадзяюцца ліквідаваць.

— Надзвычайным камісарам Мурману 14 гм. назначаны Нацарэнус.

Судовая справа проціў Коллонтай за пераховы свайго мужа—Дыбенко, запынена.

Адвакаты кн. Львова, Галіцына і Лопухіна зьвярнуліся з просьбай аб пераводзе іх з Екацерынбурга у Маскву і каб іх справа разглядалася у Маскоўскім трыбунале.

— Пастановай Савецкаго ураду ад 10 гм. Карл Ляндэр назначаны гасударсьцьвенным контролёрам.

— У БАКУ зрэюць новыя падзеі. Мусульмане атрымаўшы падмогу з Пэрсіі пачалі рухацца. У свой чарод Бакінскі рэволюцыйны камітэт стараецца забезпечыць абарону места. У Баку аб'яўлены ваенны стан. Армянскі рэвалюцыйны камітэт працуючы у згодзе з местовым савэтам звярнуўся да тутэйшых армянаў с заклікам ўходзіць у баевыя дружыны для дачы атпору насуваючымся на Баку мусульманскім проці-рэволюцыйным аддзелам.

Рух Тыфліс—Баку перарваны. У Тыфлісе спакойна.

«Извѣстія» № 95.

Беларускі тэатр.

У рочніцу свайго істнавання Першым Таварыствам Беларускай Драмы і Камэдыі засновапы ў Нядзелю 19-го мая Беларускі Народны Дом імяні Максіма Богдановіча, вядомаго нашаго паэты й літэратара. Адкрыцце адбылося вельмі пекна й вечар зацягнуўся далека за поўнач да ранку 20 мая. Пачаткам вечару была драма В. Галубка «Безвінная кроў» [2 акты]. Кароценькая, але уражлівая драма выканана артыстамі з вялікай старапнасьцю. Ролю гаспадара—айчыма веў сам аўтор. Сюжэт драмы—гэта нідаўняя ў нас сучаснасьць. Абшарнік-земляуласнік ні можа ніяк зразумець акаляючых яго ціхую сялібу цадзеяў, дасягаючых ніпамернай вострасьці клясавой барацьбы. У яго душы загараецца ніпавісьць й варагавітасьць да свайго пасынка студэнта-соцыяліста, які жыве у Пецярбурзе. Маці ўспамінае, што вось сын нават й лісту дамоў ні піша ўжо колькі часу. Кабета кахае яго як сына—хто б ен ні быў па сваім паглядам. Але ні тое ў сэрцы Гаспадара. У рэшці сын прыходзіць (а ні прыежджае) да роднай хаты, па брацку вітаецца с старым пастухом. Цітам, даручаючы яму раздаць па весцы проклямацыі, якія нападаюць ў рукі айчыма й студэнт выганяецца ім з роднай хаты. А маці й тут як маці. Ціт слаба разумее тэорыі студэнта, але чуе ў ім новаго чалавека, новаго пана. Анархія дакацілася да ціхай сялібы ў той момэнт, калі Ціт апазнаў ў сваім падпасавічу—хлапчаку кроўнаго сваяка й збіраўся адысьці са службы. Азьвярэушыя селяне і салдаты ўрываюцца ў хату забіваюць Ціта «панскаго па-

слугача». На гэтую сцэну ўлетае пасынак гаспадара, кліча усіх апомніцца, зьяўляецца з аружжам ў руках й сам Гаспадар ды ні разумеючы нічога ад злосьці, думаючы, што гэта пасынак прывеў у двор рабусьнікаў, стрэляе і забівае пасынка. Вось гэткіе тыпы драмы былі добра выказаны артыстамі амаль што ні кожным. Асабліва яркім быў Ціт ў выкананні Ф. Ждановіча. Без жаднаго штукарства, проста, натуральна веў наш слаўны артыста свайго Ціта, заслугоўваючы шчырую ўвагу і аплядысмэнты публікі. «Студэнт» ўдаўся Фальскаму ніц сабе.

С кабечаго пэрсоналу добра спраўляліся ў больш выразнейшых ролях: Гаспадыні (Я. Зорка) і Дароты [эканомкі] В. Тарасік. У кароценькай ролі маткі падпасавіча, умоўляўшайся аб найму яе хлопчыка з гаспадаром і гаспадыняй, натуральнаю была П. Мядзіолка.

Нельга прамаўчаць аб зусім кароценькай ролі Парабчанкі ў якой ўчора паказалася на беларускай сцэні маладзенькая артыстка Л. Зарніца. Гэта ўдачлівае імя гаворыць сапраўды, што зарніцы гэтай трэба дамагацца каб сьвяціць на нашай сцэні чым часьцей, развіваючы сваю прыродную здольнасьць. Маленічкі момэнт яе выступлення гаворыць аб безумоўнай іскры таленту, але размер яго для нас пакуль што ў тумані. Пасьля пьесы быў пекны рознахарактэрны дывэртысмэнт, ў каторым найвыразней выступаў Ф. Ждановіч, якога доўга клікалі на «bis».

Дывэртысмэнт закончыўся пекнай для публікі ніспадзеванкаю: выступленнем стройнаго хору ягомосьця Цераўскаго, відаць дось папрацаваўшаго над сваім хорам, выканаўшым шмат беларускіх песьняў.

Чыста народны склад песьняў пры трафнай гармонізацыі іх і добрым выкананню хора, зрабілі на публіку надта добрае ўражэнне і хор пакарыставаўся заслужанымі ім вызавамі.

Знаемы.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Дэлегацыя служачых скарбовай палаты і казначэйства выехала у Маскву у раду камісара, дзеля выяснення пытання, ці прызнаецца «савецкай» уладай прэбыванне гэтых установау у Менску «нацыянальным праступкам, ці не, а калі прызнаецца, то куды... эвакуіравацца?

Разам з гэтым будзе разбірацца пытанне аб выдачы палацкім і казначэйскім служачым дабавачных на дарагоулю.

Членам ліквідацыйных камісій управуленскіх аддзелау Л. Р. к. д. пачнецца у хуткім часе выплата пэнсіі ні с спэцыяльных управуленскіх грошай, як было дагэтуль, але з нямецкай скарбніцы. Гэто вельмі узмацовывае становішчо служачых вышэй названых установау.

Гадовы агульны сход членау епархіяльнаго сьв.—Мікалаяускаго брацтва адбудзецца сягоння, 22 мая, на якім, паміж іншым, апрача пытання а пераходзе юбілейнаго дома Беларускай Радзе, ужо разрэшаным у добрым смысле, будзе назначаны час маючаго быць зьезда духавенства і міран менскай епархіі дзеля абсуджэння матэрыяльных і прававых інтарэсау сьвяшчэна-служыцелеу і рэформы тутэйшых духоуных школ.

Бездожджье і засуха. Аб тым што німа дажджоу і стаіць засуха, што вельмі шкодна для яравых і азімавых пасевау, прыходзяць весткі болей усяго з менскаго і слуцкаго паветау.

Асігноука на сярэднюю і вышэйшую народную асьвету, разрэшана губ. зем. сабраннем, дзякуючы паддержцы вучыцелеу і наогул леваго крыла гласных на адкрыцце краеваго унівэрсытэту—60,000 р., пры умове отпуску горадам зямлі для унівэрсытэцкіх гмахау, школ для узрослых - 200,000 р., сярэдняй палітэхнічнай (земско-местовая) пад сьцягам хауруса інжэнерау школы—45,000 руб.

На пераробку ніжэйшай С.-гаспадарск. марьіна - горскай школы у сярэднюю—58,005 р.

Адпушчано вучыцельскаму хаурусу—3,000 р. на народныя чытальні з фанарамі і рухомымі кінэматографамі—60,000 р., на коопэратыуныя курсы—37,000 р. 50 к., на земуправускую бібліатэку—10,000 р.

Апрача гэтаго, пазволен у прынцыпу губэрнскі камітэт па народнай асвеці,—установа зусім нізалежачае ад земства, на штр адпушчэн крэдыт у 13,625 руб.

Другая рэгістрацыя, (с касаваннем усіх быушых) расійскіх афіцэрау, ваенных дахтароу, чыноунікау і салдат будзе зроблена у Менску ад 25 мая да 15 чэрвеня, для першых—у афіцэрскім бюро, для апошніх, г. з. салдат,—у управуленні воінскаго начальніка.

Гэтым асобам, пасьля упісывання у явачныя спіскі, выдадуць новыя рэгістрацыйныя картачкі з нямецкім штэмпэлям.

Такая праверка будзе рабіцца пасьля 15 чэрвеня кожныя 4 тыдні.

За нівыпауненне да 15 чэрвеня рэгістрацыі віноуныя пасьля гэтаго сроку будуць затрымлівацца дзеля аштрафавання да 6,000 марак, альбо арэшту да 6 месяцоу.

Рынак на тарговым пляцу у панядзелак, 20 мая, быу поуны толькі дравамі (воз—25—30 р.), ды дзе-ні-дзе малаком (кварта—1 р. 30 к.).

На конным рынку 20 мая коней было куды меней, чым на тым тыдні, дзеля гэтаго і цэны былі вышэйшыя: конь сярэдняй рукі—450 р.—500 р., лепшы конь—1,300 р.—1,500 р.

На беларускую гісторыко-этнографічную выстауку у Вільне гэтымі днямі выезжае з Менску дзеяч—беларус Р. Земкевіч с цікавымі матэрыяламі па гісторыі і этнографіі. Р. Земкевіч атрымау запрашэнне ад устраіцеляу выстаукі.

Раптоунае злажэнне поунамоцтвау губ. зем. управаю у цалком, зноу прынята назад, па прозьбе гласных губ. сабрання. Вельмі нізразумелы такія «раптоуныя» дзеі, хіляючыеся «і туды і сюды».

Надзея гаротніка.

Цемны лес яловы, вольхі ды асіны,
Грэбля каля млыну, чорная трасіна;
Курныя дзьве хаты, азярод, гуменцы,
Хлеучукоу ні звання, замест іх—трысьценцы,
Гдзе стаіць карова, як раз з рукавіцу...
Як жэ ні пазнаць мне тут сваю зямліцу?..
Ходзяць па гародзе нашы дзве курыцы,—
Іх сусед заняушы вот пачне сварыцца!
Пойдзе зараз спрэчка, пойдзе зара звадка...
Ды без гэта гора: німа ні сьвінчаці—
Ні чаго дакончыць, ні чаго пачаці,—
Жыто ні удала і німа ячменю,
Хібіла грачыха, лену будзе з жменю,
Бульба толькі можа зіму падтрымае.
Добра—калі гэтак, хто-ж яго там знае?..
Жонка нешта сохне; воспу аткачаушы
Дзеці памарнелі, гора запазнаушы...
Праца надрывае без часіны сілы
І што дзень зблізжае да сырой магілы...
Я працую зранку да самаго змроку,
Ад зімы да лета, ад Юрья да року...
Прадасі на месьці дроу, ці вобзік моху,
Купіш з жменьку солі і—жывеш патроху;
Хлеб жуеш з мякінай, запіваеш квасам
І жывеш памалу, і жывеш тымчасам...
Запражэш канягу у соху—аруеш,
Потым барануеш, сееш і гаруеш,
Як часамі градам жыто памалоце,
Альбо як затопе сено на балоце...
Цяжка мне і жыць тут, цяжка-ж і разстацца,
С той надзеяй, можа ураджай удасцца...
Родная зямелька, родны ты мой краю!
Ні магу казаць, як я цябе кахаю!...

14/III 1918 р.

Захар Вехаць.

Весткі с краю.

м. Радашковічы, віленскай г. вілейскаго пав.
(ад нашаго кар-та).

Нашыя Радашковічы за апошнія часы зрабіліся як бы цэнтрам для збыту коней. З усіх акалічных мястэчак гандляры выкупляюць каней і гонюць іх сюды ні толькі на тарговыя дні—чацьвяргі, але што дня, бо гандлярство коньмі зрабілося штодзеннай занятнай ні толькі гандляроў, але і мястэчковых жыхароў.

Даўней, каб гандляваць коньмі, трэба было знацца на іх, але цяпер—гэта саўсім лішняя забава: конь павінен мець конскую галаву і больш чым тры нагі, хоць бы сабе і пакалечаныя—ось і ўсё. У зубы ніхто ні заглядае, хоць, кажуць, толькі дарованаму каню ў зубы ні глядзяць, а тымчасам тут плацяць за найгоршую жываціну ні менш 500 рублёў. Гандляры самі кляць з свайго тавару, кажучы, што гэтых коней трэба прывязываць да плоту, каб меў на што аперціся і што гэты конь без сьвежай харчоўкі больш пяці вёрст ні пройдзе. Нікаторыя назараблялі па 5—10 рублёў, самі добра ні ведаючы, скуль такое шчасьце да іх прывалiло.

А шчасьце прывалiло з быўшай прыфронтавой паласы, дзе даўным даўно фронт зьнішчыў усю жывёліну і цяпер хадакі аттуль аблюбавалі сабе наш горад і што дня наплываюць новыя і новыя. Мо' аблюбавалі дзеля таго, што па другіх мейсцох ішчэ горш іх ашуківаюць? Чаго-ж ішчэ спадзевацца нашаму брату, калі свой свайго ўжо стаў так абдзіраць??

Я.

з. Буды, мінск. пав. *ад нашашаго кар-та).*

На граніцы мінскаго, барысаўскаго і вілейскаго павету стаіць засьценак Буды, куды ішчэ да вайны даежджалі з бліжэйшых парафій ксяндзы і адпраўлялі набажэнства. Ужо тады акалічныя каталікі рабілі старанне пазволіць ім пабудаваць у гэтай ваколіцы касьцёл. Вайна спыніла гэтыя старанні да часу рэвалюцыі. Цяпер, дзякуючы рупнасьці уласьнікаў з. Буды—яг. Даўнара і Яцкевіча, справа ужо наладзілася. Мае быць створана новая парафія, да якой адойдуць часткі—на працягу ні больш 10-ці вёрст ад новаго касьцёлу—менскай, радашкоўскай, лагойскай і карэнскай парафій.

Пры касьцелі мае быць і магільнік, што вельмі важна для тутэйшай ваколіцы. жыхаром каторай прыходзіцца вазіць нябошчыкаў больш як за 20 вёрст. Асабліва трудна прыходзіцца ў восень і вясной, калі, ні зважаючы на бездарожжэ, як раз найбольш людзі прывыклі выбірацца на той сьвет.

На пробашча новаго касьцёлу тутэйшыя парафіяне падаюць прашэнне да вышэйшаго каталіцкаго духавенства аб назначэнні ім кс. Аўгустыновіча, цяперашняго вікараго у Радашкоўскім касьцёлі,—добра знанаго беларуса.

Н.

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоунаго камандавання за 21 мая 1918 року.

З А Х А Д:

Кэммэль ўчора быў мэтаю моцных ніпрыяцельскіх атакаў. Яны адбіты са стратамі. Абаронцы гары Кэммэль дасягнулі поўнаі ўдачы. На фронці ад Воормезэлес да захаду ат Грансэтэра моцны агневы бой быў перад пяхотнымі атакамі. Глаўная іх моц была пакірована на гару Кэммэль і яе заходныя склоны. Французы, йшоўшыя наперадзі, рушалі у некольскіх калоннах. Пяхотны і артылерыйскі агонь давёў атаку да ніўдачы й прымусіў іх вертацца, нясучы вялікія страты. Мейсцовыя прарывы ніпрыяцеля ў зону ямаў былі зліквідованы нашымі контр-атакамі. Усходней Локеру французы йшчэ засталіся. Ангельскія дывізыі стаялі, як кажуць палонныя, ў трэццюй лініі гатовымі. Праз тое, што французы пацярпелі ніўдачу, то ім ні давялося ўступіць ў бой.

У вечары й на працягу ночы артылерыйскія баі даходзілі ні адзін раз да вялікай моцы. Узноўленыя ў вечары ніпрыяцельскія атакі з Локера і вечаровыя дзе-ні-дзе напады паўночна—ўсходней Локеру былі адбіты.

На іншых фронтах дзень прайшоў дось спакойна. Больш моцны агонь быў ў нашых батарэйных пазыцыях й тылавых вучастках на абодвых бакох р. Ліс, а найбольш паўночна—захадней Мэрвіля ў зьвязку с пяхотнымі баямі. У вечары так сама часова ўзмацнеў агонь каля Бюккуа і Гэбютэры, паўдневей Віллер-Брэтонэ і р. Аўры.

На іншых фронтах нічога значнаго.

За апошнія тры дні зьбіто 59 ніпрыяцельскіх аэропляноў і 3 прывязных балёны. Лейтэнант Левенгардт здабыў сваю 24-ю надземную перамогу, віц-фэльдфэбэль Рунэй свае 20 і 21 перамогі.

Першы-Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф.**

Кўрсы беларусазнаўства.

22 мая лекцыя Я. Лесіка. «Гісторыя Вялікаго княства Беларуска-Літоускаго».

Рэдактар **А. Прушынскі.**

Выдавецтва **Т-во «Заранка».**

Друкарня Я. А. Грынблята.